**УДК 929/94(470)+930.3**

# РОД ПАЦАЎ У ГІСТАРЫЯГРАФІІ XIX СТ.

*Раманенка Ю. Я.*
*(навуковы кіраўнік – А. У. Любы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт)*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны роду Пацаў у гістарыяграфіі XIX ст. Асвечаны яе галоўныя тэндэнцыі, характэрныя рысы, аўтары і выданні. Аналізуецца вопыт даследчыкаў XIX ст., іх уклад у падмурак для далейшага вывучэння роду. Пазначаны ўмовы, у якіх стала магчымым і неабходным ім звярнуць увагу на даследаванні індывідуальнага ўплыву асоб у гісторыі і актуалізаваць старыя працы па генеалогіі.*
***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія; Пацы; «доўгае XIX стагоддзе».*

# THE PACOWIE GENUS IN HISTORIOGRAPHY OF THE 19TH CENTURY

*Ramanenka Yu. Ya.*
*(Scient Director – A. V. Liuby, PhD in history, Associate Professor)*
Belarusian State University
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article is devoted to the Pacowie family in the historiography of the 19th century. It highlights its main trends, characteristic features, authors and publications. The article analyzes the experience of researchers of the 19th century, their contribution to the foundation for further study of the family. The conditions under which it became possible and necessary for them to pay attention to the study of the individual influence of individuals in history and to update old works on genealogy are indicated.*
***Keywords:*** *historiography; Pacowie; "the long 19th century".*

Для гістарыяграфіі рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы XIX ст. становіцца часам наватарстваў у гістарычных даследаваннях. Пры немэтазгоднасці займацца палітычнай гісторыяй былой дзяржавы Рэчы Паспалітай даследчыкі ўсё больш увагі надаюць персанальнай гісторыі. У XIX ст. павялічваецца цікавасць да генеалагічных даследаванняў і біяграфістыкі. У гэты час наватарскую метадалогію гісторыі прапануе Леапольд фон Ранке, што зрабіла магчымым паглядзець на гістарычныя падзеі і эпохі праз асобу і яе індывідуальны ўплыў. У першай палове XIX ст. увага надавалася перш за ўсё тым людзям, якія ўплывалі на палітычнае жыццё былых дзяржаў, напрыклад,

на ВКЛ. Наватарствам вызначалася і дзейнасць І. Лелявеля, выкладчыка Віленскага імператарскага ўніверсітэта, які таксама спрабаваў глядзець на гісторыю праз уплыў асоб. Так, ім былі распрацаваны асобныя біяграфіі манархаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

У XIX ст. даследчыкі былой Рэчы Паспалітай актуалізуюць старыя працы па генеалогіі. Ва ўмовах гістарычнай навукі гэта дало магчымасць удасканаліць існуючыя веды і метады працы з новымі выдадзенымі крыніцамі. Палітыка «разбору шляхты», якую праводзілі ўлады Расійскай імперыі, вымушала яе зацвярджаць свае правы, абапіраючыся на дакладныя крыніцы і «спансуючы» генеалагічныя і геральдычныя даследаванні.

Род Пацаў існаваў з XV па першую палову XIX ст. і пакінуў у жыцці былых зямель ВКЛ памяць пра сябе. Яе імкнуліся захаваць пародненыя з Пацамі роды, якія прэтэндавалі на іх спадчыну. Некаторыя спрабавалі зрабіць іх гісторыю часткай сваёй. Гэтыя групы маглі спансаваць даследаванні роду Пацаў агулам або асобных яго прадстаўнікоў, каб падмацаваць уласнае становішча ў новых палітычных ўмовах і дзяржаве. Больш за тое, для такіх людзей склаліся спрыяльныя ўмовы ў сувязі з тым, што ў першай палове XIX ст. апошні прадстаўнік асноўнай галіны роду памёр, не пакінуўшы прамых спадчыннікаў, з-за чаго род лічуць згаслым.

У развіцці гістарыяграфіі па гісторыі роду Пацаў на беларускіх і літоўскіх землях у канцы Сярэднявечча і ранні Новы час можна вылучыць некалькі тэндэнцый і агульных характэрных рыс. Першая – гэта фактычна з’яўленне за пазначаны перыяд толькі аднаго асобнага даследавання, прысвечанага роду Пацаў. Іншыя толькі часткова закраналі гісторыю роду, абыходзячы шмат факталагічнай інфармацыі і пакідаючы толькі самае значнае аб выбітных прадстаўніках мужчынскага полу. Другая тэндэнцыя заключаецца ў тым, што стварающца два кірункі ў выданні прац, прысвечаных выбітным родам і дзяржаўным пасадам у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Адна група ўяўляе сабой перавыданні з дадаткамі. У дадзенным выпадку аўтары толькі нанова выдаюць і рэдактуюць той тэкст, які быў напісаны папярэднікамі – Барташам Папроцкім і Каспарам Нясецкім – яшчэ ў XVII−XVIII стст. Іншая група прадстаўлена новымі даследаваннямі. Характэрнымі рысамі гістарыяграфіі па гісторыі роду Пацаў у XIX ст. з’яўляецца, па-першае, тое, што аўтары спрабуюць стварыць або дапрацаваць агульную карціну сістэмы дзяржаўных пасад і палітычнай эліты, звязаных з выбітнейшымі родамі, якія пакінулі адбітак у гісторыі

з часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Па-другое, яны напісаны і выдадзены на польскай мове. Па-трэцяе, гэтыя выданні накіраваны на даволі вузкае кола асоб шляхецкага паходжання або іншых даследчыкаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

У Лейпцыгу ў 1839 г. выйшаў першы том дапоўненага перавыдання гербоўніка Каспара Нясецкага «Korona Polska». Ён атрымаў новую назву – «Herbarz polski Kaspara Nieseckiego S. J.: powiększony dodatkami z poźniejszych autorów, rękopismów, dowodów urzędowych». Перавыданнем займаўся Ян Непамуцэн Бабровіч. Першы том змяшчае сведчанні па геральдыцы Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага, у ім пералічаны і апісаны ўсе пасады ў розных рэгіёнах дзяржаў, ёсць звесткі аб тытулах. Праца з'яўляецца вельмі грунтоўным падсумаваннем па ўрадавай сістэме, геральдыцы, тытулах. У наступных тамах увага пераносіцца ўжо на канкрэтныя шляхецкія роды, пералік ідзе ў алфавітным парадку. Так, у сёмым томе, выдадзеным у 1841 г., знаходзім сведчанні па гісторыі роду Пацаў. Аднак у сувязі з тым, што арыгінальная праца Каспара Нясецкага была выдадзена ў першай палове XVIII ст., біяграмы родаў распрацаваны ў выданні толькі да яго пачатку. Тым не менш выданне ўтрымлівае галоўныя сведчанні з жыцця прадстаўнікоў роду: гады жыцця, удзел у палітычным жыцці, шлюбы і інш. Прыведзеная інфармацыя падмацавана спасылкамі на крыніцы [1].

Перавыданнем гербоўніка Барташа Папроцкага «Herby rycerstwa polskiego», створанага ў 1584 г., заняўся Казімір Ёзаф Туроўскі. Кніга выйшла ў 1858 г. у Кракаве. У працы існуе ўнутраны падзел на гербы Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Адпаведна існуе дзве часткі, прысвечаныя гербу Гоздава, дзе пералічаны тыя фаміліі, якія сталі яго носьбітам. Няшмат увагі надаецца апісанню прадстаўнікоў гэтых родаў. Барташ Папроцкі надаў увагу толькі найбольш выбітным прадстаўнікам роду Пацаў, якія спрабавалі пабудаваць сваю палітычную кар'еру паводле царкоўнага і вайсковага шляху ў часы яго ўласнага жыцця. Гэта тычыцца Мікалая і Станіслава Пацаў. Кароткія звесткі пра іх утрымліваюцца ў другой частцы гербоўніка, звязанай з Вялікім Княствам Літоўскім. Казімір Ёзаф Туроўскі не ўнёс новай інфармацыі ў апісанне роду, аднак зрабіў выпраўленні ў тэксце [4].

Яшчэ адным перавыданням гербоўніка Каспара Нясецкага стала створаная Гіпалітам Ступніцкім праца «Herbarz Polski: imionopis zasłużonych w Polsce ludzi wszystkich stanów i czasów». У прадмове аўтар кажа аб тым, што намагаўся зрабіць гэтае выданне больш даступным,

бо арыгінальны твор быў рэдкім і каштаваў зашмат. Тэкст Нясецкага быў скарочаны і ўмешчаны ў тры тамы, якія выходзілі ў 1855–1862 гг. Разам з тым Ступніцкі дадаваў новыя сведчанні з крыніц і апавяданняў, якія былі яму даступныя. Аднак тое, што датычыцца роду Пацаў, змяшчаецца ў другім томе. Інфармацыя пра кожнага прадстаўніка адрывістая і скарочаная. Так, напрыклад, адсутнічаюць звесткі пра больш ранніх прадстаўнікоў роду, праігнаравана асоба Мікалая Юр'евіча Паца. Разам з тым аўтар дадае сведчанні пра тых, каго Каспар Нясецкі не застаў пры сваім жыцці. Частка, прысвечаная роду Пацаў, скончваецца кароткімі звесткамі з жыцця Станіслава Паца (1703–1726 гг.) [3].

У XIX ст. была створана толькі адна праца, у якой ёсць звесткі пра род Пацаў. Гэта «Senatorowie I Kniazowie Litewscy. Pacowie. Materyały historyczno-genealogiczne» Ёзафа Вольфа, выдадзеная ў 1885 г. у Пецярбургу. Гэта даследаванне самае змястоўнае з усіх прыведзеных, бо ахоплівае ўсіх прадстаўнікоў роду. Яно ўтрымлівае легенду пра паходжанне роду і знойдзеныя складальнікам факты з генеалогіі, палітычнага і эканамічнага жыцця Пацаў. Факталагічны матэрыял суправаджаюць геральдычныя выявы, партрэты, генеалагічныя табліцы. У адрозненне ад іншых аўтараў, Ёзаф Вольф надае ўвагу і жаночым прадстаўніцам, стварае паўнавартасную карціну існавання і дзейнасці роду. У кнізе прысутнічае іменны і геаграфічны паказальнік. Інфармацыя добра структуравана па розных частках, у тым ліку па пакаленнях роду. Гэта праца заклала падмурак далейшых навуковых даследаванняў [6].

Ёзаф Вольф пашырае і гендэрна, і персанальна даследаванне гісторыі роду Пацаў, каб скласці агульную карціну іх дзейнасці і існавання на працягу XV − першай паловы XIX ст. Гэта дазволіла паглядзець на гістарычную ролю роду ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, заклала падмурак для далейшага аналітычнага вывучэння. Ёзаф Вольф выкарыстаў новыя навуковыя падыходы і крыніцы, зрабіў уласны ўнёсак у развіццё гістарыяграфіі арыстакратычных родаў.

Другая праца аўтара – «Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386–1795» – была выдадзена ў 1885 г. у Кракаве. У прадмове Ёзаф Вольф адзначае недахоп у даследаванні сістэмы пасад і спісаў службовых асоб у дачыненні да Вялікага Княства Літоўскага. Ён таксама падкрэслівае праблему, звязаную з тым, што папярэднія аўтары ў асноўным абапіраюцца на не зусім дасканалую і нашмат у чым састарэлую працу Каспара Нясецкага. Падмуркам даследавання сталі Метрыка ВКЛ, надрукаваныя і выдадзеныя зборнікі актаў. Ёзаф Вольф адзначае свой крытычны падыход да фарміравання крыніцавай базы даследаван-

ня. Тут змяшчаюцца апісанні дзяржаўных пасад, храналагічныя спісы, якія ўтрымліваюць імёны людзей, што выконвалі службу на іх. У тым ліку сустракаюцца прадстаўнікі роду Пацаў. Праца суправаджаецца пасадавым і іменным паказальнікамі [5].

На падмурку існуючага і даступнага комплексу крыніц і прац папярэднікаў Адам Банецкі стварыў «Poczet Rodów w Wielikiem Księstwie Litewskem w XV i XVI wieku». Выданне выйшла ў Варшаве ў 1887 г. Зрабіўшы акцэнт на акрэсленым храналагічным прамежку, ён у сваёй працы дайшоў толькі да пятага пакалення роду Пацаў, пачынаючы ад Паца Доўкшавіча і скончваючы сынамі Мікалая Юр'евіча. Упершыню сустракаем дакладна акрэслены спіс выкарыстаных крыніц у пачатку працы, а не толькі спасылкі ўнутры або па-за тэкстам. Адам Банецкі абапіраўся і на абодва даследаванні Ёзафа Вольфа. Магчыма, менавіта адтуль ён браў сведчанні з генеалогіі, палітычнага і эканамічнага жыцця Пацаў, уключаў у свой тэкст, робячы скарочаную версію. Уводзіны апускаюць чытача ў палітычны стан Вялікага Княства Літоўскага ў акрэслены перыяд, даюць яго апісанне і акрэсліваюць характэрныя рысы. Кніга мае і свой распрацаваны паказальнік, утрымлівае генеалагічныя табліцы некаторых родаў, у тым ліку Пацаў [2].

Такім чынам, у XIX ст. не было створана комплексных даследаванняў па гісторыі роду Пацаў, аднак быў закладзены падмурак для далейшай працы па персанальных гісторыях яго асобных прадстаўнікоў. Назіраецца пераемнасць у стварэнні агульных прац па генеалогіі, геральдыцы, родавай гісторыі і палітычнай сістэме Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага паміж генеолагамі XVII−XVIII стст., публіцыстамі і даследчыкамі-пазітывістамі XIX ст. Так, спачатку аўтары займаліся перавыданнямі і рэдакцыяй прац Барташа Папроцкага і Каспара Нясецкага. Вылучым публікатарскую дзейнасць Яна Непамуцэна Бабровіча, Казіміра Ёзафа Тunion Туроўскага і Гіпаліта Ступніцкага. У канцы стагоддзя ў працэсе пашырэння крыніцавай базы і эвалюцыі метадалогіі генеалагічных даследаванняў з'явіліся працы Адама Банецкага і Ёзафа Вольфа. Вынікам стала цэласная праца апошняга аўтара, прысвечаная асобна роду Пацаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Bobrowicz, J.* Herbarz polski Kaspara Nieseckiego S. J.: powiększony dodatkami z pożniejszych autorów, rękopismów, dowodów urzędowych: w 10 t. / J. Bobrowicz. – Lipsk: Wydanie Jana Nep. Bobrowicza, 1841. – T. 7. − S. 219−231.

2. *Boniecki, A.* Poczet Rodów w Wielikiem Księstwie Litewskem w XV i XVI wieku / A. Boniecki. – Warszawa, 1887. – S. 241–243.

3. *Stupnicki, H.* Herbarz Polski: imionopis zasłużonych w Polsce ludzi wszystkich stanów i czasów; ułożony porządkiem alfabetycznym na podstawie herbarza Niesieckiego i manuskryptów: w 3 t. / H. Stupnicki. – Lwow: Łowiecka Biblioteka Cyfrowa Krzystofa Daszkiewicza, 1859. – T. 2: K–P. – S. 218–219.

4. *Turowski, K. J.* Herby rycerstwa polskiego przez Bartosza Paprockiego zebrane i wydane r. p. 1584 / K. J. Turowski. – Krakow, 1858. – S. 858–859.

5. *Wolff, J.* Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386-1795 / J. Wollf. – Krakow, 1885. – 355 s.

6. *Wolff, J.* Senatorowie I Kniazowie Litewscy. Pacowie. Materyały historyczno-genealogiczne / J. Wollf. – Petersburg, 1885 r. – 379 s.